# І Музей аўтографаў




**Таццяна Уласава скончыла бібліятэчны факультэт сталічнага Інстытута культуры ў 1980-м. Цяпер яна — дырэктар Гомельскай гарадской цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы.**

Таццяна Уласава адзначана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

Адным з галоўных пунктаў дзейнасці бібліятэкараў, як перакананa Таццяна Савельеўна, з'яўляецца краязнаўства. І кніга тут — бы компас, які беспамылкова паказвае дарогу да ўласнай душы, што неўпрыкмет пераконвае: радзіма— гэта не толькі мілы сэрцу ландшафт, а і гісторыя, якую пішуць штодня людзі. Вось іх "пяірам" і займаюцца бібліятэкары ды чытачы абласнога цэнтра. Дарэчы, апошніх — ледзь не 20 тысяч.

З праспекта Леніна (былая вуліца Замкавая) цэнтральная бібліятэка пераехала ў адрамантаваны гістарычны будынак па вуліцы Савецкай. Але брэндавая Літаратурна-мастацкая гасцёўня "Сустрэчы на Замкавай" працягвае дзейнічаць і па новым адрасе. Тут збіраюцца паэты, мастакі, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Чарговы брэнд ГЦБ — выставачная краязнаўчая зала. Яшчэ адзін з поспехам рэалізаваны праект Таццяны Уласавай — штогадовы выпуск краязнаўчага альманаха "Гомель: людзі, падзеі, факты", дзе ў храналагічным парадку "акумулююцца" звесткі аб культурных, спартыўных, эканамічна-вытворчых падзеях, а таксама аб выбітных асобах абласнога цэнтра.

А наперадзе — рэалізацыя чарговага праекта. Таццяна Савельеўна збіраецца адкрыць у Цэнтральнай бібліятэцы... Музей рэдкага аўтографа. V сённяшняй бібліятэчнай калекцыі такіх аўтографаў ужо шмат. Прыналежаць яны пісьменнікам, мастакам, палітыкам, героям Вялікай Айчыннай вайны. Пра кожнага рыхтуецца бібліяграфічная даведка. Справа — за экспазіцыяй.

**А.С.**

**На здымку**: **Таццяна Уласава**.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ